**НАЗОЎНЫ ЎЯЎЛЕННЯ (ТЭМЫ)** – спецыфічная адзінка, якая выражана сінтаксічна ізаляваным назоўнікам у назоўным склоне (або іменным спалучэннем), што называе прадмет, з'яву, уяўленне аб якіх узнікае ў свядомасці ў таго, хто гаворыць, і пра якія далей будзе выказвацца суджэнне.

У адрозненне ад зваротка (гл. **ЗВАРОТАК**) назоўны ўяўлення не называе адрасата маўлення, у адрозненне ад намінатыўных сказаў (гл. **АДНАСАСТАЎНЫ СКАЗ**) не выражае значэння існавання. Назоўны ўяўлення ўжываецца пры апісанні ўспамінаў, разважанняў: *Яфім Фёдаравіч Карскі…Як многа гавораць гэтыя словы кожнаму, хто хоць колькі-небудзь знаёмы з творчай спадчынай вялікага вучонага…* (А. Наркевіч); *Радашковічы… У пошуках працы Купала ў свае маладыя гады трапіў у гэты калісьці “заштатны горад” Віленскай губерні* (Г. Каханоўскі); *Партызанскія будні… Гэта не рамантыка. Гэта хутчэй чаканне нечага горшага, чымсьці ёсць* (А. Андруховіч); *Віцебскі тэатр… Хто не ведае яго сёння ў Беларусі!* (С. Пятровіч);

Ад аднасастаўных сказаў трэба адрозніваць і некаторыя іншыя ***сінтаксічныя канструкцыі,*** выражаныя назоўнікам у назоўным склоне, такія, як уласныя назвы твораў, часопісаў, газет, карцін, надпісы на шыльдах, этыкетках і пад. Пры іх сінтаксічнай кваліфікацыі неабходна ўлічваць, ці выступаюць яны са сваімі родавымі паняццямі, ці без іх. У першым выпадку яны выконваюць сінтаксічную функцыю прыдаткаў: *Але самыя споведныя, самыя шчымлівыя і самыя звонкія радкі… нараджаліся ў перыяды гістарычных духоўных узрушэнняў роднага краю – нагадаем вершы “Сінія касачы”, “Родная мова”…* (Г. Бураўкін); *Раман “Чужое неба” – адзін з самых асабістых твораў Барыса Сачанкі, адкрываецца раздзелам “Вёска майго маленства”* (С. Андраюк).

Ужытыя без родавых паняццяў уласныя назвы твораў, часопісаў, газет, надпісы на шыльдах і пад. з'яўляюцца спецыфічнымі сінтаксічнымі назыўнымі канструкцыямі, якія выконваюць функцыю называння без значэння быційнасці, вымаўляюцца з канстатацыйнай інтанацыяй.

*М.С.Ржавуцкая*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ